**Беларускі дзяржаўны універсітэт**

УДК 947.6(043.3)"1961 – 1991"

**Півавар Мікалай Васільевіч**

# Развіццё гістарычнага краязнаўства ў Беларусі ў 1961–1991 гг. (на прыкладзе грамадскага і школьнага накірунку)

07.00.02 – айчынная гісторыя

Аўтарэферат
**дысертацыі на суісканне**
**вучонай ступені кандыдата гістарычных навук**

Мінск 2006

Дысертацыя выканана ў установе адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава»


Навуковы кіраўнік: доктар гістарычных навук,прафесар
Русецкі Аркадзь Уладзіміравіч,
Установа адукацыі «Віцебскі дзяржаўны
універсітэт імя П.М. Машэрава», кафедра
гісторыі Беларусі



Афіцыйныя апаненты: доктар гістарычных навук, прафесар
Ладысеў Уладзімір Фёдаравіч,
Беларускі дзяржаўны універсітэт, кафедра
гісторыі Беларусі новага і навейшага часу

кандыдат гістарычных навук,
Скалабан Віталь Уладзіміравіч,
Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальны архіў
Рэспублікі Беларусь», загадчык аддзела


Апаніруючая арганізацыя: Установа адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны
універсітэт імя А.А. Куляшова»

Абарона адбудзецца 23 лютага 2006 г. у 14 гадзін на пасяджэнні савета Д 02.01.05 па абароне дысертацый на суісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук пры Беларускім дзяржаўным універсітэце на адрасу: 220050, г. Мінск, вул. Ленінградская, 8, аўд. 407.
Тэл. вучонага сакратара: 227-45-11.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Аўтарэферат разасланы «20» студзеня 2006 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый
доктар гістарычных навук, дацэнт В.І. Менькоўскі

**Актуальнасць тэмы даследавання.** Састаўной часткай сучаснага грамадскага жыцця з'яўляецца краязнаўства – грамадскі навуковы рух, накіраваны на ўсебаковае пазнанне роднага краю і далучэнне мясцовага насельніцтва да актыўнага ладу жыцця. Менавіта краязнаўства падымае да самага высокага ўзроўню грамадскую ініцыятыву, фарміруе патрыятызм, актыўную грамадзянскую пазіцыю, любоў да Радзімы – тыя якасці, якія адыгрываюць важную ролю ў станаўленні і развіцці дзяржаўнай ідэалогіі.

Краязнаўства ў яго сённяшнім разуменні выступае не толькі як сродак навуковага пазнання гісторыі краіны, але і як інструмент развіцця культуры, захавання нацыянальнай спадчыны. Пры дапамозе метадаў лакальнага гістарычнага даследавання новыя рысы набывае працэс выхавання гістарычнай свядомасці і патрыятызму. Пазнанне гісторыі краю ва ўсіх яе праяўленнях, разуменне шляхоў яго развіцця, садзейнічаюць пабудове грамадзянскай супольнасці. З другога боку, краязнаўства дапамагае забяспечваць акадэмічную навуку фактлагічнай базай, звесткамі, пісьмовымі і рэчавымі гістарычнымі крыніцамі.

У сістэме адукацыі краязнаўства на мясцовым матэрыяле праз даступнасць, зацікаўленне інтарэсаў, актыўныя формы ўспрыняцця і пазнання існуючых рэалій дапамагае аналізаваць заканамернасці гістарычнага развіцця, дамагаючыся больш высокага разумення вывучаемага матэрыяла.

У выхаванні і педагогіцы менавіта краязнаўчы прынцып пазнання свайго краю прапагандуецца ад Асветніцтва да нашых часоў. Вывучэнне гісторыі і культуры краю з'яўляецца мэтавызначальным прынцыпам для выхавання ў моладзі патрыятызму і павагі да нацыянальных традыцый і прынцыпаў супольнага жыцця.

На працягу XX стагоддзя развіццё гістарычнага краязнаўства перажывала розныя стадыі – ад усплеска актыўнасці на пачатку стагоддзя і сапраўднага росквіту ў БССР ў 20-я гады, да заняпаду і крызісу ў 30-я – 40-я гады. Шэраг айчынных і замежных даследчыкаў лічаць, што новы яркі ўздым у развіцці гістарычнага краязнаўства назіраецца ў 90-х гадах XX стагоддзя - з атрыманнем суверэнітэту нашай краінай. У той жа час па-за ўвагай навукоўцаў застаецца перыяд 1960–80-х гадоў, ў якім былі падрыхтаваны перадумовы актыўнага развіцця краязнаўства ў канцы XX стагоддзя. Прадстаўляецца неабходным разглядзець асноўныя дасягненні і набыткі менавіта гэтага перыяду.

З атрыманнем нашай краінай суверэнітэту, краязнаўства можа і павінна адыграць актыўную ролю ў фарміраванні беларускай дзяржаўнасці, станаўленні нацыянальнай ідэалогіі. У гэтым выпадку цікава прасачыць, якую ролю адыгрывала краязнаўства ў развіцці савецкага грамадства ў другой палове XX стагоддзя. Менавіта ў 60–80-я гады адбылося фактычнае аднаўленне яго дзейнасці, стрыманае фактычнай забаронай у 30-я – пач. 50-х гадоў. Набыткі тых часоў могуць быць карыснымі пры вырашэнні задач, якія стаяць перад грамадствам на цяперашні час.

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.** Тэма з'яўляецца часткай комплекснай рэгіянальнай навукова-тэхнічнай праграмы "Беларускае Паазер'е: прыродныя рэсурсы, матэрыяльная і духоўная культура", якая зацверджана Саветам УА "Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя

П.М. Машэрава" (пратакол №7 ад 2.02.2001 г.) і тэмы кафедры гісторыі Беларусі УА "Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава" "Асаблівасці фарміравання этнасацыяльных працэсаў паўночнага рэгіёна Беларусі" (пратакол № 3 ад 15.11.2000 г.).

**Мэта і задачы даследавання.** Мэта дысертацыйнага даследавання: прааналізаваць развіццё грамадскага і школьнага накірункаў гістарычнага краязнаўства Беларусі ў перыяд з 1961 г. па 1991 г.

*Задачы працы:*

– паказаць месца грамадскага і школьнага напрамкаў гістарычнага краязнаўства Беларусі ў культурна-гістарычным працэсе 60–80-х гг. XX ст.;

– вызначыць асноўныя этапы развіцця і значэнне дзейнасці Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры;

– акрэсліць прыярытэтныя накірункі дзейнасці краязнаўчай камісіі Беларускага фонду культуры, Беларускага краязнаўчага таварыства, гісторыка-культурных таварыстваў 2-й паловы 80-х гг. XX ст.;

– прааналізаваць ролю і месца школьнага краязнаўства ў патрыятычным выхаванні насельніцтва і развіцці гістарычнай навукі краіны;

– акрэсліць вынікі, метады і сродкі развіцця школьнага краязнаўства ў 60–80-я гады XX ст.;

– вылучыць асаблівасці, цяжкасці і праблемы, якія перашкаджалі развіццю грамадскага і школьнага напрамкаў гістарычнага краязнаўства Беларусі.

**Аб'ект і прадмет даследавання.** Аб'ектам даследавання з'яўляецца працэс развіцця гістарычнага краязнаўства ў Беларусі ў 60–80-я гады XX ст. **Прадмет** даследавання – грамадскае і школьнае гістарычнае краязнаўства Беларусі.

**Метадалогія і метады даследавання.** Тэарэтычнай і метадалагічнай базай дысертацыйнага даследавання з'яўляюцца прынцыпы гістарызму, аб'ектыўнасці і сістэмнасці, заснаваныя на прыярытэце дакументальных фактаў і адмаўленні ад ідэалагічнай дагматыкі. У дысертацыйным даследаванні выкарыстаны апісальны і параўнальна-гістарычны метады. У адпаведнасці з пастаўленымі мэтай і задачамі быў таксама выкарыстаны сістэмна-структурны падыход да аналізу праблемы. Для пацвярджання гістарычнай дакладнасці атрыманых вынікаў выкарыстаны метады аналогіі, супрацьпастаўлення і параўнання.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.** На аснове архіўных матэрыялаў і апублікаваных крыніц створана комплексная работа, у якой вызначаны вытокі сучаснага краязнаўства, прааналізаваны працэс арганізацыйнага-метадычнага ўмацавання грамадскага і школьнага накірункаў краязнаўства, яго асноўныя формы і вынікі працы. Упершыню ў беларускай гістарыяграфіі комплексна, рознабакова даследуецца развіццё гістарычнага краязнаўства Беларусі ў 60–80-я гг. XX ст. Упершыню праведзена даследаванне суадносін і ўзаемадзеяння розных накірункаў краязнаўства, дзяржаўнай палітыкі ў галіне гістарычнага краязнаўства краіны ў другой палове XX ст. Вылучаны рэгіянальныя асаблівасці, а таксама прааналізаваны і паказаны характэрныя рысы краязнаўства БССР з краязнаўчым рухам у РСФСР, УССР і прыбалтыйскіх рэспублік. Раскрыта роль

гісторыка-культурных аб'яднанняў у грамадскім жыцці Беларусі другой паловы 80-х гадоў XX ст. Праведзены аналіз дазваляе зрабіць вывад пра школьнае краязнаўства, як своеасаблівы сінтэз грамадскага і дзяржаўнага накірункаў. Паказана важная роля пошукавага руху як асобнай галіны школьнага краязнаўства ў вывучэнні гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і выхаванні патрыятызму ў моладзі краіны. Атрыманыя вынікі з'яўляюцца асновай для далейшай распрацоўкі вывучэння гісторыі гістарычнага краязнаўства Беларусі, грамадска-палітычнага жыцця нашай краіны ў другой палове XX стагоддзя.

У дысертацыйнай працы ўпершыню ўведзены ў навуковы зварот і прааналізаваны раней не вывучаныя архіўныя матэрыялы, якія закранаюць шырокі спектр праблем, звязаных з развіццём грамадскага і школьнага напрамкаў у гістарычным краязнаўстве Беларусі ў 1961–1991 гг. Асобна адзначым увядзенне ў навуковы зварот вялікай колькасці дакументаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, якія тычацца дзейнасці Беларускага фонда культуры, яго краязнаўчай камісіі. Зроблены параўнальны аналіз развіцця гістарычнага краязнаўства Польшчы, Украіны і Беларусі дасць магчымасць выкарыстоўваць найбольш значныя дасягненні савецкага і замежнага краязнаўства ў сучасным грамадска-палітычным жыцці нашай краіны.

**Практычная значнасць атрыманых вывадаў.** Выкладзены ў дысертацыі матэрыял можа быць выкарыстаны для падрыхтоўкі вучэбнай літаратуры і абагульняючых прац, стварэння лекцыйных курсаў па гісторыі Беларусі і славянскіх народаў, спецыяльных курсаў па гісторыі краязнаўства.

Асэнсаванне назапашанага вопыту можа служыць не толькі навуковаму даследаванню гісторыі краязнаўства і грамадскіх адносін, але і выкарыстоўвацца пры фарміраванні дзяржаўнай ідэалогіі ў нашай краіне на сучасным этапе. Уведзеныя ў навуковы абарот новыя матэрыялы, абагульненні і высновы дысертацыйнага даследавання могуць спрыяць пошуку і распрацоўцы новых аспектаў даследуемай тэмы.

Матэрыялы дысертацыйнага даследавання выкарыстоўваюцца ў вучэбным працэсе праз курс лекцый па гістарычнаму краязнаўству Беларусі ў ВДУ ім. П.М. Машэрава і гісторыі Беларусі навейшага часу ў Лужаснянскай школе-інтэрнат-гімназіі. Матэрыялы даследавання выкарыстаны пры падрыхтоўцы метадычных дапаможнікаў "Методыка пошукаў помнікаў прыроды ў краязнаўчай працы" (Віцебск, 1999) і "Туристско-краеведческие походы и экскурсии в окрестностях Витебска" (Віцебск, 2002).

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону:**

1. У развіцці гістарычнага краязнаўства Беларусі ў 1961-1991 гг. побач з дзяржаўным напрамкам важнае месца займалі грамадскі накірунак, які абапіраўся на грамадскія арганізацыі і аматараў-краязнаўцаў і школьны, які з'яўляўся своеасаблівым сінтэзам грамадскага і дзяржаўнага накірункаў і развіваўся праз арганізацыю краязнаўчых даследаванняў у школьных музеях, пошукавую і турысцка-краязнаўчую дзейнасць навучэнцаў.

2. Галоўную ролю ў развіцці грамадскага гістарычнага краязнаўства ў Беларусі ў 1960-80-я гады адыграла Беларускае добраахвотнае таварыства аховы

помнікаў гісторыі і культуры (БДТАПГіК), якое працавала ў цеснай сувязі з ЛКСМБ, таварыствам "Веды" і піянерскай арганізацыяй, выкарыстоўваючы магчымасці, дадзеныя ім уладай.

3. Краязнаўчая камісія Беларускага фонду культуры, Беларускае краязнаўчае таварыства, нефармальныя гісторыка-культурныя таварыствы 2-й паловы 80-х гг. і краязнаўцы-аматары дзейнічалі ў напрамку актывізацыі вывучэння гісторыі рэспублікі, захавання і папулярызацыі культурнай спадчыны беларускага народа, стварэння праграм гісторыка-культурнага адраджэння.

4. Шырокае развіццё школьнага краязнаўства ў 60–80-я гады XX ст. было абумоўлена яго шматвектарнасцю ў выглядзе турысцка-краязнаўчага, музейнага і пошукавага напрамкаў, кожны з якіх меў уласную, спецыфічную ролю ў выхаванні моладзі і стымуляцыі цікавасці да гісторыі.

5. Актыўны ўдзел моладзі ў краязнаўчым руху праз збор гістарычнага, этнаграфічнага, фальклорнага матэрыялу, дзейнасць па захаванню гісторыка-культурнай спадчыны, стварэнню школьных музеяў і пошукавы рух з'явіўся важным элементам выхавання ў яе гістарычнай свядомасці і фарміравання сацыялістычнай ідэалогіі.

6. Развіццё грамадскага і школьнага напрамкаў гістарычнага краязнаўства Беларусі стрымлівалася адсутнасцю каардынацыйнага цэнтра, вузкай вучэбнай, навуковай, інфармацыйнай, даведачнай і выдавецкай базамі, недахопам падрыхтаваных кадраў для вядзення краязнаўчай працы, спецыялістаў па іх падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы.

**Асабісты ўклад суіскальніка.** Дысертацыя выканана самастойна, другія аўтары ў праведзенні даследавання і апрабацыі яго вынікаў не ўдзельнічалі. У працэсе работы над дысертацыяй упершыню вывучаны, сістэматызаваны і ўведзены ў навуковы абарот аб'ёмны архіўны матэрыял. Аўтарам зроблены крытычны аналіз работ айчынных і замежных даследчыкаў.

**Апрабацыя вынікаў даследавання.** Матэрыялы і вынікі даследаванняў па тэме дысертацыі былі пакладзены ў аснову 16 дакладаў на наступных навуковых канферэнцыях: навукова-практычнай канферэнцыі "90 лет Витебской ученой архивной комиссии" (Віцебск, 1999); архіўных чытаннях, прысвечаных 150-годдзю са дня нараджэння А.П.Сапунова "Архіўная спадчына Віцебшчыны як крыніца вывучэння гісторыі краю" (Віцебск, 2001); рэспубліканскіх краязнаўчых чытаннях педагагічных работнікаў "Школьнае краязнаўства, як сродак рэалізацыі гуманістычнага выхавання навучэнскай моладзі" (Мінск, 2002); рэспубліканскай канферэнцыі работнікаў устаноў адукацыі "Выхаванне грамадзянскасці і патрыятызму сродкамі турызму і краязнаўства" (Віцебск, 2002); рэспубліканскіх краязнаўчых чытаннях устаноў адукацыі "Месца школьнага краязнаўства ў сучасным грамадстве" (Мінск, 2003); міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Міжнародны экалагічны досвед і яго выкарыстанне на Беларусі" (Віцебск, 2003); міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "История и культура Европы в контексте становления и развития региональных культур: актуальные проблемы из исторического прошлого и современности" (Віцебск, 2003);

рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі "Культурологические аспекты вузовского образования" (Мінск, 2003); рэспубліканскай навуковай канферэнцыі "Славянскі свет: мінулае і сучаснасць" (Мінск, 2004); VI-х рэспубліканскіх краязнаўчых чытаннях педагагічных работнікаў "Краязнаўчая работа як сродак патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі"; міжнароднай навуковай канферэнцыі прысвечанай 70-годдзю гістарычнага факультэта БДУ "XXI век: актуальные проблемы исторической науки" (Мінск, 2004); II-й міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Преподавание краеведения и москвоведения в высших учебных заведениях" (Москва, 2004); рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі "Віцебшчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны" (Віцебск, 2004); рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі прысвечанай 50-годдзю гістарычнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта ім. Я. Купалы "Подготовка педагогических и научных кадров историков и развитие исторической науки в Беларуси" (Гродна, 2004); міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 70-годдзю гістарычнага факультэта Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А. Куляшова "Раманаўскія чытанні" (Магілёў, 2004); міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі маладых даследчыкаў "Садружнасць навук. Баранавічы-2005" (Баранавічы, 2005), рэспубліканскай навуковай канферэнцыі "Актуальные проблемы новой и новейшей истории Европы и США" (Мінск, 2005).

**Апублікаванасць вынікаў даследавання.** На тэме дысертацыйнага даследавання аўтарам апублікавана 14 работ, сярод якіх 4 артыкулы у навуковых часопісах, 1 – у энцыклапедыі "Беларускі фальклор"; 7 – у зборніках матэрыялаў міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцый, 2 тэзісаў дакладаў на канферэнцыях і архіўных чытаннях. Агульны аб'ём публікацый склаў 57 старонак.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, разбітых на параграфы, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц, дадаткаў. Агульны аб'ём дысертацыі склаў 123 старонкі, у тым ліку спіс выкарыстаных крыніц – 23 старонкі. Бібліяграфія ўключае 360 найменняў.

## Асноўны змест дысертацыі

Ва ўводзінах разглядаецца сутнасць гістарычнага краязнаўства, даецца кароткі аналіз этапаў развіцця гістарычнага краязнаўства Беларусі. Вызначаюцца яго накірункі і робіцца вывад, аб тым, што назапашаны ў другой палове XX ст. вопыт і дасягненні ў беларускім гістарычным краязнаўстве (асноўныя накірункі, формы, метады, падыходы ў працы) у значнай ступені з'яўляюцца базай і асновай для сучаснага яго развіцця.

У першай главе **"Гістарыяграфія і крыніцы"** разглядаецца стан распрацоўкі праблемы і аналізуюцца крыніцы даследавання. Прадстаўлены агляд асноўных крыніц.

**Гістарыяграфія.** Комплекс прац, якія маюць дачыненне да развіцця гістарычнага краязнаўства ў Беларусі ў 1961–1991 гг. падзяляецца на некалькі груп. У першую ўваходзяць працы савецкіх, постсавецкіх і замежных даследчыкаў, у якіх

разглядаюцца асобныя пытанні развіцця краязнаўства СССР ў другой палове XX ст. Падобныя даследаванні даюць магчымасць вызначыць асноўныя тэндэнцыі ў развіцці гістарычнага краязнаўства, што мелі месца ў вывучаемы перыяд у СССР ў цэлым і саюзных рэспубліках у прыватнасці і разам з гэтым экстрапаліраваць атрыманыя вынікі на БССР з мэтай правядзення параўнальнага аналізу.

Гісторыі развіцця гістарычнага краязнаўства СССР у 1960–80-х гг. прысвяцілі свае працы А.В. Ушакоў[1], А.М. Разгон[2], С.Л. Ціхвінскі[3]. Аналізу стану і перспектыў развіцця школьнага краязнаўства ў СССР прысвечаны даследаванні Д.В. Кацюбы[4], І.Р. Цімошына[5]. Найбольш грунтоўнай працай, у якой аналізуецца прадмет даследавання, асноўныя накірункі яго развіцця, з'яўляецца работа П.В. Іванова "Основы школьного краеведения"[6].

Вялікі ўклад у вывучэнне гістарычнага краязнаўства СССР і РФ унеслі расійскія даследчыкі ў постсавецкі час. Сярод дысертацыйных даследаванняў, прысвечаных адзначанай праблеме перш за ўсё трэба вызначыць доктарскую дысертацыю Т.Д. Румінай "Эволюция краеведения в России в кон. XIX–XX веках"[7]. Каштоўнасць даследавання ў тым, што навукоўца зрабіла вывады аб важнай ролі краязнаўства ў развіцці грамадскіх аб'яднанняў, залежнасці развіцця краязнаўства ад ідэалагічнай заангажаванасці кіруючых колаў і інш. Выклікаюць цікавасць працы В.А. Бердзінскіх[8], У.Ф. Казлова[9], Т.О. Размуставай[10], А.В. Рэмізава[11]. Асобна адзначым выдадзеныя ў 1989–2004 гадах працы прызнанага аўтарытэта ў галіне гістарычнага краязнаўства, акадэміка Педагагічнай акадэміі Расіі С.О. Шмідта[12], які ўнёс важны ўклад у распрацоўку гісторыі краязнаўства. Цікавасць выклікаюць даследаванні украінскіх навукоўцаў Ю.З. Данілюка, Л.І. Еўсялеўскага, П.Т. Тронько[13].

---

[1] Кабанов П.И., Ушаков А.В. О советском историческом краеведении // История СССР. 1963. – №3. – С. 3 - 17.

[2] Разгон А.М. Пути советского краеведения // История СССР. 1967. – №4. – С. 190-201.

[3] Тихвинский С. Л. Состояние и задачи дальнейшего развития исторического краеведения в СССР // Вопросы истории. 1988. – №1. – С. 24-31.

[4] Кацюба Д.В. Теория и практика исторического краеведения в школе и в вузе. Автореф. дис. ... д-ра пед.наук: 13.00.01 / Челяб. гос. ун-т. – Челябинск,1993. – 43 с.

[5] Тимошин И.Р. Советское краеведение – важнейшее средства воспитания трудящихся на революционных традициях. Дис. ... канд. ист. наук: 07.00.09. / Мос. гос. у-т. – М., 1966. – 16 с.

[6] Иванов П. В. Основы школьного краеведения. – Петрозаводск: Изд-во ПГУ, 1986. – 106 с.

[7] Рюмина Т.Д. Эволюция краеведения в России в кон. XIX – XX веках. на материалах Москвы. Автореф дис. ... д-ра. ист. наук: 07.00.09 / Ист-арх. ин-т. – М., 1999. - 48 с.

[8] Бердинских В.А. Основные этапы развития краеведения в XX веке [Электронны рэсурс]. М.: РГГУ, 2003. Рэжым доступа: http://iai.rgu.ru/berd.htm

[9] Козлов В.Ф. Региональная история России и сопредельных государств // Преподавание краеведения и москвоведения в высших учебных заведениях. – М.: АНО ИЦ "Москвоведение", 2002. – 292 с. – С. 123-36.

[10] Размустова Т.О. Исторические модели краеведения в России // Материалы Всероссийской научно-практической конференции "Современное состояние и перспективы развития краеведения в регионах России". – М., ЦДЮТур РФ, 1999. – С. 94-101.

[11] Ремизов А.В. Омское краеведение 1930-1960-х годов: Очерк истории. – Омск: Изд. ОмГУ, 1998. – 89 с.

[12] Шмидт С.О. Краеведение и документальные памятники: Учеб. пособие. – Тверь: Книжное издательство, 1992. – 86 с.; Шмидт С. История, современное состояние и перспективы развития краеведения // Краеведение в России: История. Современное состояние. Перспективы развития. М.: АНО ИЦ «Москвоведение», 2004. – 304 с. – С. 11 - 30.

[13] Данилюк Ю.З. Общественные формы охраны памятников истории Украины на современном этапе // Историческое краеведение в СССР: Вопросы теории и практики. – Киев: «Наукова думка», 1991. – 275 с. – С. 242-246; Евселевский Л.И. Некоторые итоги и задачи изучения истории промышленных предприятий Украины // Историческое краеведение в СССР: Вопросы теории и практики. – Киев: «Наукова думка», 1991. – 275 с. – С. 218-220; Тронько П.Т. Развитие исторического краеведения на Украине // Историческое краеведение в СССР: Вопросы теории и практики. – Киев: «Наукова думка», 1991. – 275 с. – С. 8-15.

У час працы над тэарэтычнымі палажэннямі даследавання выкарыстоўваліся працы вучоных з ЗША, Германіі і Польшчы, якія маюць важнае значэнне для распрацоўкі метадалогіі даследаванняў, удакладнення дэфініцый гістарычнага краязнаўства, разумення яго філасофіі, асноўных тэндэнцый і праблем развіцця. Прафесар Прынстанскага універсітэта С. Коткін[1] у артыкуле "О краеведении и его методологии", разглядаючы метадалогію гістарычнага краязнаўства, аналізуе яго на прыкладах Германіі, Расіі і Савецкага Саюза. Розныя аспекты краязнаўства ў Польшчы даследавалі Г. Бенчук (Bienczyk)[2], З. Кручэк (Kruczek)[3], В. Ліпняцкі (Lipniacki)[4] і іншыя. Адзначаныя працы карысны для пошуку найбольш аптымальных шляхоў развіцця беларускага краязнаўства, удасканалення методыкі яго даследаванняў, выбару ацэнак стану і перспектыў у яго развіцці.

Асноўныя рысы развіцця гістарычнага краязнаўства Беларусі ў 1960–70-я гады былі асветлены ў вучэбным дапаможніку "Историческое краеведение Белоруссии"[5]. У асобным раздзеле прааналізаваны некаторыя напрамкі развіцця гістарычнага краязнаўства. Даследчыкі хоць і акрэслілі галоўныя пытанні краязнаўчай працы ў Беларусі, але асноўную ўвагу надалі вучэбнаму матэрыялу.

Некаторыя пытанні гісторыі краязнаўства Беларусі разглядаюцца ў публікацыях Э.М. Загарульскага, А.В. Мальдзіса, А. Смалянічa[6]. Сувязь гістарычнага краязнаўства і архіўнай справы разглядаецца ў працах .Ф. Шумейкі[7], А. Карлюкевіча[8]. Роля краязнаўства ў ахове помнікаў гісторыі і культуры характарызуецца ў рабоце Л.М. Несцярчука "Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі"[9]. Праблемы краязнаўчай дзейнасці музеяў Беларусі асвятлялі А.М. Калбаска[10], В. Курыленак[11]. У працы А.А. Гужалоўскага[12] "Музеі Беларусі (1941–1991)" асобны раздзел прысвечаны развіццю грамадскіх і школьных музеяў у пасляваенны перыяд. Можна пагадзіцца з меркаваннем даследчыка аб тым, што

---

[1] Коткин Стефан (Принстон, США). О краеведении и его методологии // Методология региональных исторических исследований. Материалы международного семинара 19-20 июня 2000 г., Санкт-Петербург». СПб: «Нотабене», 2000. – 230 с – С.16-22.

[2] Bienczyk, Grzegorz. Krajoznawstwo i jego związki z turystyką – Warszawa : Wyisza Szkoia Ekonomiczna, 2003. – 208 s : ISBN: 83-86990-53-8.

[3] Kruczek, Zygmunt Metodyka krajoznawstwa. Krakyw : Druk. Narodowa 1983 242 s.

[4] Lipniacki, Wojciech. Elementy teorii krajoznawstwa. T. 1, Krajoznawstwo jako dziaialnosc poznawcza Szczecin : Polskie Tow. Turystyczno-Krajoznawcze : Zarząd Wojewydzki, 1985. 300 s.

[5] Историческое краеведение Белоруссии /Учебное пособие для исторических факультетов вузов республики; под ред. Э.М. Загорульского/. – Мн.: Изд. БГУ им. В И. Ленина, 1980. 263.

[6] Загарульскі Э. Краязнаўства ўчора і сення // Спадчына. 1989. – № 2. С. 11-13; Мальдзіс А. // Краязнаўчая газета. 2003, №1, красавік. – С. 4; Смаляніч А. Гістарычнае краязнаўства: праблемы і перспектывы // Беларуская мінуўшчына. 1995, – № 1. – С. 61.

[7] Шумейко М.Ф. Роль исторического краеведения в Беларуси в подготовке архивистов республики // Преподавание краеведения и москвоведения в высших учебных заведениях: - М.: АНО ИЦ "Москвоведение", 2002 - 292 с. - С. 118-124.

[8] Карлюкевіч А. Знойдзенае і ... згубленае? // "Веснік архівіста". Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып.1. / Рэд. кал. Р.П. Платонаў (гал. рэд.) і інш. - Мн.: БелНДІДАС, 2000. 266 с. С. 92-97.

[9] Несцярчук Л.М. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі: Асноўныя этапы фарміравання, сучасны стан і перспектывы. – Мн.: БЕЛТА, 2003. 286 с

[10] Калбаска А.М. Агляд развіцця музейнай справы ў Беларусі (1971-1985) // Беларускія музеі. Гісторыя, Хроніка. Сучаснасць. Музейныя сшыткі. Навук. Метад. Зб. Мн.: БелНПК, 1998. С. 52-57.

[11] Курыленак В. Станаўленне асистніцкай работы музеяў на Беларусі // Гісторыя. праблемы выкладання 2003. - №3. - С. 56-59.

[12] Гужалоўскі А.А. Музеі Беларусі (1941 1991 гг.). Мн.: НАРБ, 2004 - 218 с.

агульнае пашырэнне музейнай дзейнасці ў 1960–80-я гады было вынікам узрастання грамадскай актыўнасці і цікавасці да гісторыка-культурнай спадчыны.

Інфармацыю аб рэгіянальных асаблівасцях развіцця гістарычнага краязнаўства Беларусі з сярэдзіны 1980-х – да пачатку 1990-х гадоў можна знайсці ў працах В. Жылко[1], В. Задаля[2], А.І. Марзалюка[3], М.А. Ткачова[4], І.Г. Шпырковай[5] і інш. Гэтыя даследаванні багатыя фактаалагічным матэрыялам, адлюстроўваюць асноўныя тэндэнцыі, якія мелі месца ў развіцці краязнаўства Беларусі з канца 1980-х гадоў. Цікавыя звесткі аб жыцці і дзейнасці краязнаўцаў-аматараў, якія працавалі ў другой палове XX ст. утрымліваюць работы Л. Кулажанкі[6], А.М. Пяткевіча[7], В.У. Скалабана[8].

Некаторыя аспекты развіцця пошукавага руху ў СССР і Беларусі і яго сувязь з краязнаўствам раскрылі ў сваіх артыкулах С. Бяспанскі[9], С.С. Кацэвіч[10], В.Э. Шомадзі[11]. Аўтары даюць высокую ацэнку пошукаваму руху, адзначаюць пры гэтым пэўныя складанасці яго развіцця з прычыны неадназначнага стаўлення з боку дзяржавы. У працах У.І. Лемяшонка[12], В.У. Скалабана[13] аналізуецца ход стварэння ў Беларусі гісторыка-дакументальных хронік "Памяць".

Асобныя пытанні школьнага краязнаўства разглядаліся ў работах А.П. Госцева[14], М.А. Рыца[15], В.У. Фядуты[16], Д.М. Чорнага[17], якія даюць характарыстыку асноўным працэсам і тэндэнцыям развіцця школьнага

---

[1] Жылко В. Краязнаўства ў Лунінецкім раёне // Загароддзе-2. Матэрыялы навукова-краязнаўчай канферэнцыі "Палессе – скрыжаванне культур і часу" 25-27 верасня 1999 г., – Пінск. Мн.: Тэхналогія, 2000. – 207 с. – С. 185.

[2] Задаль В. Традыцыі і сёння гродненскага краязнаўства // Краязнаўчая газета. 2005. – №11, сакавік. – С. 5

[3] Марзалюк А. Краязнаўства ў Краснапольлі // Беларускі гістарычны часопіс. 2003. № 9. – С. 70-74.

[4] Ткачоў М. Пахоўдзя: Кніга публіцыстыкі /Рэд.-склад. С.П. Самуэль – Мн.: БелЭн, 1994. – 288 с.

[5] Шпыркова И.Г. Общественные музеи Слонимщины // Матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі "Музеі і развіццё гістарычнага краязнаўства" – Гродна: ГОУТ, 1990. – 100 с. – С. 67-68.

[6] Кулажанка Л. Літаратурныя мясціны Беларусі: краязнаўчы даведнік: дапаможнік для настаўнікаў. У 3-х кнігах. Кн.1. Брэсцкая, Віцебская і Гомельская вобласці. – Мн.: БелЭн., 2000, – 286 с.

[7] Пяткевіч А. Людзі культуры з Гродзеншчыны: Даведнік. Гродна: ГрДУ, 2000. – 356 с.

[8] Скалабан В. 65-годдзе дня нараджэння Генадзя Кахановіскага // Кантакты і дыялогі. 2001. – № 1. – С. 30.; Скалабан В. Сучасныя беларускія краязнаўцы // Краязнаўчая газета. 2005, – №11, сакавік. – С. 2; №12. – С. 2.

[9] Бяспанскі С. Да гісторыі пошукавага руху на Магілёўшчыне // Магілёўская даўніна. – Магілёў: УПКП "Магілёўская ўзбуйненая друкарня", 2001. – 204 с. – С. 133-139

[10] Коцевич С. С. Красные следопыты. – Мн.: Беларусь, 1976. – 65 с

[11] Шомоди В.Э. Из истории поискового движения // Детский туризм и краеведение Беларуси /Авт.-сост.: С.С. Митряхович. – Мн.: «РИФТУР», 2003. – 104 с. – С. 85 – 90.

[12] Лемяшонак У.В. Архіўная дакументалістыка у выданні хронікі-дакументальнай кнігі "Памяць": магчымасці і стан [Электронны рэсурс]. – М.: РГГУ, 2003. Рэжым доступа: http //vestnik.rsuh.ru/51/hr51.htm

[13] Скалабан В. Историко-документальная хроника городов и районов Беларуси "Память": эволюция краеведческого издания (1997-2002гг.) // Студії архівної справи та документознавства. – К., 2003. Том 10. – С. 187-189.

[14] Госцеў А.П. Карані і вытокі, або магчымасці школьнага краязнаўства // Мінулае Гродзеншчыны. Навукова-метадычны дапаможнік для настаўнікаў гісторыі і геаграфіі. Вып 5 / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука. – Гродна: ГАІПКПКРСА. 1998. – С. 3-31.

[15] Риц М.А. Краеведение – живая школа воспитания. (Из опыта работы СШ 2 г. Верхнедвинска). – Мн.: Народная асвета, 1966. – 32 с

[16] Фядута В.У. Месца і роля школьнага гістарычнага краязнаўства ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці вучняў [Электронны рэсурс] Гродна: ГрДУ, 2004. Рэжым доступа: http://www.grsu.unibel.by/~litte/html/confer/publ/97/etnas97/ch11.html

[17] Чорны Д. М. Краязнаўчая работа ў школе. З вопыту Клецкай СШ N2. – Мн.: Народная асвета, 1976. – 62 с.

краязнаўства ў 1960–70-я гады. Аднымі з найбольш важных прац па гісторыі школьнага краязнаўства Беларусі з'яўляецца калектыўная праца "Детский туризм и краеведение в Беларуси"[1] і даследаванне І.М. Пракаповіча "Сістэма школьнага краязнаўства"[2].

Кола літаратуры, што так ці інакш закранае праблематыку гістарычнага краязнаўства, дастаткова шырокае. Аднак, трэба прызнаць, што гісторыя краязнаўства Беларусі ў 1960-80-я гады, не стала тэмай комплекснага даследавання. Улічваючы тую ролю, якую адыгрывае гістарычнае краязнаўства на сучасным этапе развіцця грамадства Беларусі і суседніх краін, прадстаўляецца патрэбным напісанне ўсебаковага даследавання, прысвечанага яго развіццю ў 1960-80-я гады.

Каб даследаваць найбольш складаныя аспекты развіцця гістарычнага краязнаўства Беларусі, аўтар звярнуўся да аналізу **дакументальных крыніц** – як апублікаваных, так і архіўных матэрыялаў.

Пры падрыхтоўцы дысертацыі выкарыстоўваліся афіцыйныя дакументы ЦК КПСС, ЦК КПБ, Савета Міністраў СССР, Савета Міністраў БССР, ЦК ВЛКСМ, ЦК ЛКСМБ якія вызначалі стратэгію і асноўныя накірункі развіцця краязнаўства ў БССР[3].

У ходзе даследавання выкарыстоўваліся дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусі: ф. 492 (Рэспубліканскі савет БДТАПГіК), ф. 1030 (праўленне таварыства "Веды"); фонд Беларускага фонду культуры (Краязнаўчая камісія), Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці: ф. 487 (Віцебскае абласное аддзяленне БДТАПГіК), ф. 2797 (Віцебскі абласны аддзел народнай адукацыі), ф. 119 (сакратарыят Віцебскага абласнога камітэта ЛКСМБ); Дзяржаўнага архіва Гродзенскай вобласці: ф. 224 (Гродзенскае абласное аддзяленне БДТАПГіК); Дзяржаўнага архіва Магілёўскай вобласці: ф. 124 (Магілёўскі абласны аддзел народнай адукацыі), ф. 1244 (краязнаўцы Магілёўшчыны: воп. 2,3,19), ф. 2930 (Магілёўскае абласное аддзяленне БДТАПГіК).

Пры правядзенні даследавання былі выкарыстаны матэрыялы бягучых архіваў упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама, Віцебскага абласнога цэнтра пазашкольнай працы з дзецьмі і падлеткамі, Віцебскага дзяржаўнага універсітэта, грамадскіх аб'яднанняў Віцебскай, Гродзенскай абласцей. Пры напісанні даследавання былі выкарыстаны прыватныя архівы краязнаўцаў Беларусі.

Другая глава **"Развіццё грамадскага краязнаўства ў 1961–1991 гг."** складаецца з трох параграфаў у якіх разглядаюцца асноўныя накірункі развіцця грамадскага краязнаўства ў 60 – пачатку 90-х гг. XX ст.

**2.1.** У параграфе разглядаецца дзейнасць Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры як грамадскай краязнаўчай арганізацыі.

---

[1] Детский туризм и краеведение Беларуси. – Мн.: «РИФТУР», 2003. – 104 с.

[2] Пракаповіч І. Сістэма школьнага краязнаўства. Метадычны дапаможнік. – Мн.: ВДА "Папіграф", 2004. – 98 с.

[3] Документы ЦК ВЛКСМ. 1971. – М.: Молодая гвардия, 1973-1984; Зборнік загадаў і інструкцый Міністэрства Асветы БССР (1965-1990); Зборнік нарматыўных дакументаў Міністэрства народнай асветы (1991-2000); Зборнік нарматыўных дакументаў Міністэрства адукацыі і навукі (2001-2004); Збор пастаноў Урада Рэспублікі Беларусь. Мн., 1991 – 1994 (Да верасня 1991г. – Збор пастаноў Урада Беларускай ССР); Охрана памятников истории и культуры: Сборник документов. – М.: Сов. Россия, 1973. – 191 с.; Сборник официальных документов по детско-юношескому туризму, краеведению, организации отдыха детей и молодежи. /Составитель Ю.С. Константинов. – М.: ЦДЮТур МО РФ, 1999. – 231 с.

Галоўным накірункам дзейнасці БДТАПГіК стала захаванне помнікаў матэрыяльнай і духоўнай культуры народа, далучэнне шырокіх слаёў насельніцтва да вывучэння гісторыка-культурнай спадчыны, палітычных і гістарычных з'яў, навукі, мастацтва і выкарыстанне іх з мэтай камуністычнага выхавання народа. Аналіз дзейнасці гэтай арганізацыі дазваляе сцвярджаць, што яе, у поўнай ступені, можна лічыць краязнаўчай. З самага пачатку ў дакументах БДТАПГіК згадваецца як краязнаўчая, а ўтвораныя ў іншых рэспубліках (ЛітССР, ЭССР) такія ж таварыствы мелі назвы "аховы помнікаў гісторыі і культуры і краязнаўства".

Ужо на пачатку дзейнасці таварыства для яго было характэрна разуменне сваёй дзейнасці як краязнаўчай. Напрыклад, Цэнтральны Савет таварыства звярнуўся ў Савет Міністраў БССР з прапановай аб арганізацыі пры Міністэрстве культуры навукова-метадычнага савета па ахове помнікаў культуры і краязнаўству; накіраваў прапанову ЦК КПБ аб выданні краязнаўчага часопіса. Асвету і прапаганду гісторыка-культурнай спадчыны арганізоўвалі універсітэты ведаў аб помніках гісторыі і краязнаўства і інш.

На працягу 60 – 80-х гадоў XX ст. БДТАПГіК адыграла важную ролю ў развіцці грамадскага гістарычнага краязнаўства Беларусі. Таварыства ўцягнула ў сваю дзейнасць каля 2,1 млн. індывідуальных членаў (1991 г.). Была створана грамадская сістэма аховы помнікаў гісторыі і культуры, адрэстаўравана, аднаўлена і збудавана вялікая колькасць помнікаў гісторыі і культуры мясцовага і рэспубліканскага значэння. З удзелам членаў таварыства падрыхтаваны і выдадзены шматлікія выданні краязнаўчай тэматыкі.

У канцы 1980-х гг. з павялічэннем сацыяльнай актыўнасці ў грамадстве назіраецца ўсплеск цікавасці да краязнаўства. Менавіта ад членаў таварыства зыходзілі новыя ініцыятывы (утварэнне грамадскага руху ў падтрымку рэстаўрацыі, арганізацыя нефармальных таварыстваў, пашырэнне тэматыкі даследаванняў і іншыя).

Дзейнасць членаў таварыства была б яшчэ больш выніковай, калі б ёй не перашкаджалі аб'ектыўныя, а часта і суб'ектыўныя прычыны. Сярод іх адзначым недастатковую фінансавую базу таварыства, невялікую колькасць кваліфікаваных спецыялістаў для правядзення рэстаўрацыйных работ, слабую іх падрыхтаванасць.

**2.2.** Параграф прысвечаны працы краязнаўчай камісіі Беларускага фонду культуры і Беларускага краязнаўчага таварыства.

Адным з сродкаў развіцця культурна-гістарычнага жыцця грамадства стала створанае ў красавіку 1987 г. Беларускае аддзяленне савецкага фонду культуры (БФК). Арганізацыя ставіла перад сабой задачы садзейнічання развіццю культуры ў Беларусі. У структуры таварыства была ўтворана краязнаўчая камісія, якой у мэтах сістэматызацыі вывучэння гістарычнай і культурнай спадчыны беларускага народа была распрацавана праграма "Краязнаўства".

На працягу 1987–1990 гг. краязнаўчай камісіяй была праведзена значная праца па разгортванню арганізаванага краязнаўчага руху. Вынікам яе стала стварэнне 27 снежня 1989 г. рэспубліканскага краязнаўчага таварыства (БКТ). За вельмі кароткі час свайго існавання краязнаўчая камісія БФК і яе спадкаемца БКТ зрабілі значны

ўклад у развіццё краязнаўства і разгортвання яго як грамадскага руху. Адбыліся якасныя змены як у формах працы, так і змесце краязнаўчай дзейнасці. Шэраг ініцыятыў сучаснасці і распрацоўка шматлікіх актуальных праблем гістарычнай навукі Беларусі былі сфармуляваны, актуалізаваны і акцэнтаваны менавіта намаганнямі гэтых арганізацый.

**2.3.** У параграфе асвятляецца краязнаўчая дзейнасць грамадскіх таварыстваў, аб'яднанняў і краязнаўцаў-аматараў у 2-й палове 1980-х – 1991 гг.

Разам з краязнаўчай камісіяй Беларускага фонду культуры, якая аб'яднала шырокія колы навуковай інтэлігенцыі, ствараюцца нефармальныя аб'яднанні, якія ў новых умовах жадалі па-новаму вырашаць праблемы захавання гісторыка-культурнай спадчыны. Да ліку апошніх адносяцца грамадскія аб'яднанні "Майстроўня", "Талака" (Мінск), "Талака" (Гомель), "Паходня", "Гродзенская краязнаўчая асацыяцыя" (Гродна), "Узгор'е" (Віцебск), "Мапэка" (Магілёў) і іншыя. Гэтыя таварыствы ўнеслі важны ўклад у краязнаўчыя даследаванні розных рэгіёнаў Беларусі, спрыялі зменам у грамадскай думцы адносна гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Так, дзякуючы дзейнасці клуба "Узгор'е" у Віцебску былі выратаваны некаторыя помнікі гісторыі і культуры і месцы горада (Трынітарскі клаштар, гістарычная забудова Успенскай горкі), падрыхтаваны да рэстаўрацыі (касцёл Св. Варвары), праведзена добраўпарадкаванне некаторых месцаў горада (рэчышча Віцьбы, Сямёнаўскія могілкі), аказана дапамога археолагам, якія праводзілі раскопкі ў Віцебску.

Важную ролю ў развіцці гістарычнага краязнаўства 60-80-я гг. ХХ ст. адыгралі краязнаўцы-аматары. Сярод іншых адзначым А.М. Белакоза, В.А. Ермалёнка, М.Х. Шавінскага, А.М. Пяткевіча, М.Ф. Мельнікава, І.І. Філіповіча і інш. Сваімі даследаваннямі, пошукам і вывучэннем матэрыялаў, публікацыямі ў рэспубліканскім і мясцовым друку яны ўнеслі значны ўклад у развіццё гістарычнай навукі, выхаванне патрыятызму, гістарычнай свядомасці і нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Сярод даследчыкаў было шмат людзей, для якіх збор матэрыялаў, палявыя даследаванні, публікацыя артыкулаў і папулярызацыя ведаў станавіліся галоўнай мэтай жыцця. Праз сустрэчы са школьнікамі, выступленні ў якасці кансультантаў па асобных пытаннях мясцовай гісторыі і культуры, стварэнне асабістай (часта непрафесійнай) інфармацыйнай базы звестак пра родны край, выступленні ў рэспубліканскім і мясцовым друку яны фарміравалі цікавасць да гістарычнага лёсу Радзімы і жаданне мясцовага насельніцтва да вывучэння краёвай гісторыі.

Трэцяя глава **"Развіццё школьнага краязнаўства ў 1961–1991 гг."** складаецца з трох параграфаў і ў ёй разглядаюцца асноўныя рысы развіцця школьнага краязнаўства ў 60 – пачатку 90-х гг. ХХ ст.

**3.1.** У параграфе разглядаецца сутнасць школьнага краязнаўства і яго турысцка-краязнаўчы накірунак.

Школьнае краязнаўства – гэта ўдалы прыклад спалучэння грамадскага і дзяржаўнага краязнаўства. З аднаго боку ў ім прысутнічае пэўнае кіраўніцтва з боку міністэрства адукацыі і падначаленых яму структур (абласныя, гарадскія,

раённыя аддзелы адукацыі), выдзяляюцца некаторыя сродкі на заробак захавальнікам школьных музеяў і на правядзенне заняткаў у краязнаўчых гуртках. З другога, удзел настаўнікаў і вучняў у большай ступені мае добраахвотны характар і праяўляецца у асноўным у выглядзе пазашкольнай дзейнасці. У вывучаемы перыяд (з 1960-х і да канца 1980-х гг.) краязнаўства ва ўрочнай, праграмнай працы ў школах Беларусі практычна адсутнічала, а мела месца ў асноўным у пазашкольнай дзейнасці.

У развіцці школьнага гістарычнага краязнаўства ў 1960–80-я гады можна вызначыць наступныя накірункі, на якіх яно найбольш актыўна развівалася, а менавіта: турысцка-краязнаўчы: развіццё школьных музеяў; пошукавы.

Важную ролю ў развіцці турысцкага накірунку ў школьным краязнаўстве адыграла Цэнтральная дзіцячая экскурсийна-турыстычная станцыя (ЦДЭТС). Ёй належыць галоўная кіруючая роля ў развіцці турысцкага накірунку ў школьнага краязнаўства Беларусі ў вывучаемы перыяд. Станцыя праводзіла паходы, турысцкія злёты, тэматычныя экспедыцыі, арганізоўвала выставы, агляды-конкурсы музеяў, семінары па турызму, выдавала лістоўкі, плакаты, інфармацыйныя бюлетэні.

Адной з цікавых і дзейнасных форм развіцця гістарычнага краязнаўства Беларусі ў 1960-80-я гады, развіцця патрыятызму, любові да Радзімы, сталі саюзныя і рэспубліканскія экспедыцыі піянераў і школьнікаў па родным краю, якія абвяшчаліся на адзін - два гады. Яны праводзіліся ў межах доўгатэрміновай турысцка-краязнаўчай экспедыцыі "Мая Радзіма – СССР". Краязнаўчы прынцып экспедыцыі добра прасочвасцца і пацвярджаецца тэматыкай Усесаюзных тэматычных маршрутаў, якія былі накіраваны ў першую чаргу на вывучэнне асобных раздзелаў гісторыі краіны: падзей, звязаных з рэвалюцыяй, вайной, сацыялістычным будаўніцтвам.

Арыентацыя на краязнаўчы прынцып у пазашкольнай дзейнасці добра праглядаецца ў шэрагу пастаноў Міністэрства Адукацыі ў якіх падкрэслівалася, што турыстычныя падарожжы за межы вобласці магчымы толькі ў выпадку, калі школа, ці іншая ўстанова дакументальна пацвердзіць наяўнасць ва ўдзельнікаў групы значка "Турыст СССР", атрыманага за падарожжы па родным краю. Забаранялася правядзенне экскурсій за межы Беларусі, калі вучні не вывучалі памятныя і гістарычныя месцы свайго раёна, вобласці

3.2. Параграф прысвечаны аналізу краязнаўчай працы школьных музеяў.

Важным накірункам развіцця школьнага краязнаўства ў 1960–80-я гг. стала стварэнне ў школах Беларусі шырокай сеткі школьных музеяў, якія адыгрывалі значную ролю ў пазашкольнай і пазакласнай выхаваўчай працы.

Вывучэнне школьнікамі гісторыі сваіх мясцін як правіла, завяршалася стварэннем музеяў калгасаў, саўгасаў, прамысловых прадпрыемстваў, устаноў адукацыі, воінскіх падраздзяленняў, якія ўдзельнічалі ў вызваленні Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Відавочны рост колькасці школьных музеяў. Калі ў 1958 г. у Беларусі было каля 400 школьных музеяў, то ў 1982 г. іх налічвалася ўжо больш за 10 тысяч. З іх 3.5 тыс. музеяў, куткоў і залаў былі

прысвечаны жыццю і дзейнасці У.І. Леніна, каля 3 тыс. музеяў і пакояў адлюстроўвалі рэвалюцыйную, баявую і працоўную славу мінулага краю, больш за 1 тыс. мемарыяльных музеяў, 2,5 тыс. гісторыка-краязнаўчых музеяў і гурткоў.

Змены ў духоўным жыцці савецкага грамадства ў другой палове 1980-х гадоў прывялі да ўзнікнення новых падыходаў у школьным краязнаўстве. Музеі становяцца цэнтрамі вывучэння і адраджэння гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны, народных традыцый і абрадаў.Назіраюцца новыя тэндэнцыі ў структуры школьных музеяў. З аднаго боку, вызначылася тэндэнцыя скарачэння колькасці музеяў, з другога, – перапрафіляванне існуючых. Калі раней большасць з музеяў мела вузкую ваенна-патрыятычную альбо этнаграфічную накіраванасць, а экспазіцыі былі распрацаваны ў падпарадкаванні ідэалагічным задачам камуністычнага выхавання, то к канцу 80-х і, асабліва, пачатку 90-х гадоў XX ст. профіль школьных музеяў змяняецца, галоўным чынам на гісторыка-краязнаўчы, экспазіцыі становяцца комплекснымі. Абавязкова распрацоўваюцца раздзелы аб гісторыі роднай школы, старадаўняй гісторыі роднага краю і яго лепшых людзях.

3.3. У параграфе разглядаецца пошукавы рух як сфера краязнаўчай дзейнасці.

Пошукавы рух – унікальная з'ява грамадскага жыцця СССР у 2-й палове XX ст. На працягу пасляваенных гадоў вызначыліся тры асноўныя арганізатары грамадскага пошукавага руху ў СССР. Перш за ўсё, гэта былі сваякі і родзічы загінуўшых ці прапаўшых без вестак салдат і афіцэраў; па-другое, жыхары тых месцаў, дзе адбываліся баі; па-трэцяе, ветэраны баёў, якія шукалі звесткі аб сваіх аднапалчанах і дамагаліся ўвекавечання памяці загінуўшых. Дзейнасць двух апошніх груп, на наш погляд, складае спецыфічную частку краязнаўчых даследаванняў. Школьная моладзь стала браць актыўны ўдзел у пошукавых мерапрыемствах. Разумеючы значнасць школьнага краязнаўства як важнага элемента адукацыйна-выхаваўчай працы па фарміраванню выхавання савецкага патрыятызму і інтэрнацыяналізму, дзяржава падтрымала ідэю масавага пошукавага руху.

На працягу 1960–80-х гг. удзельнікамі пошукавага руху праведзена значная праца. Былі ўстаноўлены імёны больш за 30 тысяч воінаў Чырвонай Арміі, партызан, падпольшчыкаў, якія доўгі час лічыліся загінуўшымі. Каля 2 тысяч воінаў, якія былі ўзнагароджаны ў гады вайны баявымі ўзнагародамі, але па шэрагу прычын не змаглі атрымаць іх, атрымалі гэтыя ўзнагароды. Створана 726 клубаў баявой славы, напісаны 1523 летапісаў калектываў, камсамольскіх арганізацый. Матэрыялы, атрыманыя пошукаўцамі, актыўна выкарыстоўваліся пры стварэнні гісторыка-дакументальных хронік раёнаў “Памяць”.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

1. Краязнаўства як грамадскі рух на навуковай аснове даследуе гісторыю, культуру, прыроду невялікіх тэрыторый, уносіць свой уклад у ахову і выкарыстанне гісторыка-культурнай спадчыны. Сучаснае краязнаўства падзяляецца на трўшны асноўныя групы: дзяржаўнае, ажыццяўляемае рознымі ведамствамі, зыходзячы з іх камптэнцыі; грамадскае, якое існуе на добраахвотных пачатках і школьнае, якое з'яўляецца якасным прыкладам сінтэзу грамадскага і дзяржаўнага накірункаў. Грамадскі напрамак краязнаўства развіваўся праз дзейнасць грамадскіх арганізацый, аматараў-краязнаўцаў. Школьны напрамак краязнаўства развіваўся праз сістэму турысцка-краязнаўчай дзейнасці, арганізацыю краязнаўчых даследаванняў у школьных музеях і пошукавай дзейнасці. На працягу 60–80-х гг. XX ст. краязнаўства Беларусі стала важным інструментам вырашэння праблем, якія стаялі перад грамадствам краіны: стварэння сістэмы грамадскай аховы помнікаў гісторыі і культуры, выхавання патрыятызму і савецкага інтэрнацыяналізму, фарміравання дзяржаўнай ідэалогіі [1; 2; 3; 4, 5; 7; 12].

2. На працягу 1960 – 80-х гадоў важную ролю ў развіцці грамадскага краязнаўства адыграла Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры (БДТАПГіК). Яго дзейнасць стала важным дасягненнем у развіцці гістарычнага краязнаўства. Таварыства прыцягнула да грамадскага і навуковага вывучэння розных аспектаў жыццядзейнасці значную колькасць насельніцтва краіны. Паступова склаліся асноўныя накірункі працы таварыства, была створана грамадская сістэма аховы гісторыка-культурнай спадчыны, адрэстаўравана, аднаўлена і збудавана вялікая колькасць помнікаў гісторыі і культуры, мемарыялаў мясцовага і рэспубліканскага значэння, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Значная колькасць помнікаў гісторыі і культуры Беларусі захавалася выключна дзякуючы дзейнасці таварыства. Пры садзейнічанні таварыства была арганізавана падрыхтоўка і выданне "Звода помнікаў гісторыі і культуры Беларусі", вывучаліся і захоўваліся гістарычныя цэнтры гарадоў. Падрыхтаваны і надрукаваны сотні выданняў рознай тэматыкі. Вопыт, назапашаны ў справе аховы і выкарыстання помнікаў гісторыі і культуры, рабіў БДТАПГіК своеасаблівым настаўнікам кадраў для савецкіх помнікаахоўных устаноў. У сваю чаргу кіраўнікі і супрацоўнікі ўстаноў, якія бралі ўдзел у мерапрыемствах таварыства, паспяхова выкарыстоўвалі яго вопыт і магчымасці ў культурным будаўніцтве. Значную ролю ў развіцці грамадскага краязнаўства адыгралі ЛКСМБ, таварыства "Веды", піянерская і некаторыя іншыя грамадскія арганізацыі. Дзейнасць таварыства стала важным фактарам росту актыўнасці ў 2-й палове 80-х гг. XX ст. як навукоўцаў, так і краязнаўцаў-аматараў [3; 6; 11; 12; 14].

3. З другой паловы 1980-х гадоў адметную ролю у развіцці гістарычнага краязнаўства адыгралі культурна-асветніцкія грамадскія аб'яднанні: краязнаўчая камісія Беларускага фонда культуры, Беларускае краязнаўчае таварыства, Беларуская краязнаўчая асацыяцыя, "Талака", "Паходня", "Узгор'е", "Майстэрня" і іншыя. Дзякуючы дзейнасці гісторыка-культурных аб'яднанняў былі выратаваны некаторыя помнікі гісторыі і культуры ў гарадах Беларусі. Адбыўся пералом у грамадскай думцы адносна гісторыка-культурнай спадчыны. На хвалі зменаў у

палітычным жыцці краіны адбыліся адчувальныя змены ў адносінах да захавання нацыянальнай спадчыны і ў дзяржаўных установах. Дзейнасць таварыстваў па ахове помнікаў гісторыі і культуры стала школай грамадскай актыўнасці жыхароў розных рэгіёнаў Беларусі. Даследаванні, якія праводзіліся членамі грамадскіх арганізацый краязнаўчай накіраванасці і краязнаўцамі-аматарамі ляглі ў аснову шэрагу публікацый, манаграфій па гісторыі Беларусі і яе рэгіёнаў, што садзейнічала развіццю гістарычнай навукі і пашырэнню яе крыніцазнаўчай базы. Дзейнасць грамадскіх арганізацый краязнаўчай накіраванасці і краязнаўцаў-аматараў у вобласці музейнай справы садзейнічала арганізацыі ў Беларусі музеяў краязнаўчага профілю, а таксама пераафармленню экспазіцый, не адпавядаючых краязнаўчаму прынцыпу. Былі папоўнены калекцыі і фонды абласных і рэспубліканскіх дзяржаўных архіўных сховішчаў (асабліва па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны), распрацавана канцэпцыя і выдадзены гісторыка-культурныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі 'Памяць'. Важную ролю ў развіцці гістарычнага краязнаўства адыгралі краязнаўцы-аматары. Сваімі даследаваннямі, пошукам і вывучэннем матэрыялаў, публікацыямі ў рэспубліканскім і мясцовым друку яны ўнеслі значны ўклад у выхаванне патрыятызму, гістарычнай свядомасці і нацыянальнай самасвядомасці насельніцтва Беларусі [1; 10; 12; 14].

4. У 1960-80-я гг. у краіне была створана дзейнасная сістэма школьнага краязнаўства, у якім асноўнымі накірункамі былі: турысцка-краязнаўчы, стварэнне школьных музеяў, пошукавы рух. Прыярытэт атрымаў турысцка-краязнаўчы накірунак, які стаў таксама асновай для дзейнасці музейнага і пошукавага. У школьным краязнаўстве вылучыліся два асноўныя кампаненты - праграмны і пазашкольны, прычым другі атрымаў большую вагу. Асноўная ўвага надавалася працы абласных, раённых і гарадскіх устаноў, якія працавалі непасрэдна са школьнікамі. У азначаны час сфармірміравалася сістэма арганізацыі і правядзення масавых турысцкіх мерапрыемстваў і падрыхтоўкі турысцкіх кадраў. Пошукавы рух са справы адзінак энтузіястаў пераўтварыўся ў шырокі грамадскі рух, які падтрымліваўся як Міністэрствам адукацыі, так і Міністэрствам абароны. Дзякуючы працы пошукаўцаў былі вернуты з нябыту тысячы імёнаў абаронцаў Айчыны, якія паклалі сваё жыццё за яе незалежнасць. Увага дзяржавы да развіцця гэтага накірунку гістарычнага краязнаўства і ускладаемыя функцыі ў выхаванні патрыятызму ў моладзі краіны ў 1960–1980-я гг і на сучасным этапе, узровень арганізацыі пошукавага руху і даследаванняў дае падставы класіфікаваць гэты від краязнаўства як "ваеннае краязнаўства" і прагназаваць яго ўстойлівае развіццё. У 1960–80-я гады у БССР школьнае краязнаўства паспяхова выконвала задачы пастаўленыя перад ім грамадствам. Адзначым, што задачы ва ўмовах савецкага грамадства былі спецыфічныя: выхаванне савецкага патрыятызму, пралетарскага інтэрнацыяналізму, атэізму і інш. Вопыт і дасягненні беларускага гістарычнага краязнаўства, назапашаныя ў 60-80-я гг. XX ст. ў значнай ступені з'явіліся базай і асновай для сучаснага развіцця [2; 3; 4; 13].

5. Краязнаўства адыграла значную ролю ў выхаванні моладзі праз яе ўдзел у працы па вывучэнні і захаванні гісторыка-культурнай спадчыны і лакальных даследаваннях краю. Актыўны ўдзел моладзі ў краязнаўчым руху – турысцка-

краязнаўчым, музейным, пошукавым, што выразілася ў зборы гістарычнага, этнаграфічнага, фальклорнага матэрыялу, дзейнасці па захаванню гісторыка-культурнай спадчыны і стварэнню грамадскіх музеяў – з'яўляліся адметнымі фактарамі выхавання патрыятызму, грамадзянскіх якасцяў і фарміравання сацыялістычнай ідэалогіі. Стварэнне і развіццё шматлікіх грамадскіх школьных музеяў было важнай з'явай ў культурным жыцці БССР 1960–1980-я гады. Яны выступалі своеасаблівымі клубамі, якія аб'ядноўвалі людзей, пераважна школьнікаў, па іх зацікаўленасці і давалі магчымасць праявіць і рэалізаваць свае здольнасці. Галоўным фактарам, які аб'ядноўваў моладзь вакол грамадскіх музеяў, была цікавасць да гісторыі сваёй малой радзімы, клопат пра захаванне і папулярызацыю распавядаючых аб ёй помнікаў гісторыі і культуры, падзей Вялікай Айчыннай вайны ў сваім рэгіёне. На працягу 70–80-х гг. XX ст. арганізуючую і каардынуючую ролю ў развіцці ўсіх трох напрамкаў школьнага краязнаўства адыгрывалі Усесаюзная турысцка-краязнаўчая экспедыцыя "Мая Радзіма – СССР" і мэтавыя экспедыцыі. У арганізацыі і правядзенні комплекса гэтых мерапрыемстваў важную ролю адыгралі Цэнтральная дзіцячая турысцка-экскурсійная станцыя, абласныя і раённыя яе аддзяленні [2; 6; 9; 13].

6 У 60–80-я гады XX ст. праца па краязнаўству мела шэраг асаблівасцяў у параўнанні з іншымі перыядамі развіцця краіны – выхаваўчы накірунак (адыграла значную ролю ў выхаванні моладзі), абмежаваную тэматыку (вывучэнне гісторыі савецкага перыяда: падзей грамадзянскай вайны, Вялікай Айчыннай вайны, сацыялістычнага будаўніцтва ў пэўным рэгіёне), была заідэалагізавана (вывучэнне некаторых пытанняў падавалася аднабока, у адпаведнасці з прынцыпам партыйнасці). Краязнаўства стала масавым, у той жа час часта мела фармальны характар. Грамадскі і школьны краязнаўчы рух у вывучаемы перыяд развіваліся пад кантролем і кіраўніцтвам ЦК КПБ, урада рэспублікі, Міністэрстваў Асветы, культуры БССР, мясцовых органаў кіравання, у супрацоўніцтве з грамадскімі арганізацыямі і навуковымі ўстановамі. Час ад часу не дакладна прадуманая дзейнасць партыйных і савецкіх органаў прыводзіла да фармалізацыі грамадскіх пачынанняў, перавагі ідэалагічных канструкцый над агульназначнымі гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі. Вузкая вучэбная, навуковая, інфармацыйная, даведачная і выдавецкая база, недахоп падрыхтаваных кадраў для вядзення краязнаўчай працы ў значнай ступені перашкаджалі стварэнню сістэмы краязнаўчай працы ў школе і дзейнасці грамадскіх арганізацый краязнаўчай накіраванасці, стваралі цяжкасці па абуджэнню і развіццю ў грамадзян Беларусі гістарычнай свядомасці, нацыянальнай годнасці. Недахоп кадраў для вядзення краязнаўчай працы, спецыялістаў па іх падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы ў некаторай ступені кампенсаваўся дзейнасцю грамадскіх арганізацый і краязнаўцаў-аматараў. Стварэнне грамадскіх музеяў часцей за усё грунтавалася на актыўнасці краязнаўцаў-аматараў, іх энтузіязме і глыбокім веданні гісторыі сваёй малой радзімы [3; 8; 13; 14].

## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ ПРАЦ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

### Артыкулы ў навуковых часопісах і зборніках

1. Півавар М.В. Краязнаўчая дзейнасць клуба «Узгор'е» ў Віцебску ў канцы 1980 – пачатку 90-х гадоў // Веснік Віцебскага дзяржаўнага універсітэта. – 2004. – № 4. – С. 10-13.

2. Півавар М В. Пошукавы рух як сфера краязнаўчай дзейнасці // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2005. – № 1. – С. 36-39.

3. Півавар М.В. Гістарычнае краязнаўства ў Беларусі ў другой палове XX стагоддзя // Беларускі гістарычны часопіс. – 2005. № 3. – С. 46-52.

4. Півавар М.В. Клуб "Дзвіна" – асяродак гістарычнага краязнаўства ў школе // Народная асвета. – 2005. – №3. – С . 49-52.

### Артыкул у энцыклапедыі "Беларускі фальклор"

5. Півавар М.В. Краязнаўства // Беларускі фальклор: Энцыклапедыя: У 2 т. Т.1: Акапэла-Куццproperly. / Рэдкал.: Б.П. Пашкоў і інш. - Мн.: БелЭн., 2005. - 768 с. – С. 719-721.

### Матэрыялы навуковых канферэнцый

6. Півавар М.В. Развіццё краязнаўства на Беларусі ў другой палове XX ст. // История и культура Европы в контексте становления и развития регио-нальных цивилизаций и культур: актуальные проблемы из исторического прошлого и современности. Материалы международной научно-теоретической конференции. – Витебск: Издательство УО «ВГУ им. П.М. Машерова», 2003. – 455 с. – С. 232-233.

7. Півавар М.В. Развіццё краязнаўства ў Польшчы і Беларусі ў XX ст. і яго стасункі з экалагічным турызмам: мінулае і сучаснасць, замежны і мясцовы досвед // Міжнародны экалагічны досвед і яго выкарыстанне на Беларусі. Зборнік навуковых артыкулаў. – Віцебск: ВФ УА ІСВ, 2003. – 276 с. – С. 170-174.

8. Півавар М.В. Месца краязнаўства ў гістарычнай навуцы і ідэалогіі Беларусі, Расіі, Украіны ў другой палове XX ст. // Славянскі свет: мінулае і сучаснае. Матэрыялы Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі. 26 сакавіка 2004 г. У 3-х частках. Ч.3. – Мн.: БДПУ. - 274 с. – С. 138-143

9. Півавар М.В. Пошукавы рух Беларусі ў 2-й палове XX ст. // Віцебшчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны: Матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, 24 чэрвеня 2004 г. - Віцебск: Выдавецтва УА "ВДУ імя П.М. Машэрава". - 159 с. – С. 118-122.

10. Півавар М. Краязнаўца з Віцебска, або Не забывайма пра сваіх рупліўцаў // Настаўніцкія інавацыі. – № 2/3. Метадычны бюлетэнь для настаўнікаў. – Глыня, 2005. – С. 34-38.

11. Півавар М.В. Грамадскі накірунак гістарычнага краязнаўства Беларусі (1960-1980 гг.) // Содружество наук. Барановичи-2005. Материалы международ-

ной научно-практической конференции молодых исследователей, г. Барановичи, 22 февраля 2005 г.: В 2 ч. Ч.1. - Баранавічы: УО "БарГУ", 2005. – 411 с. – С. 226-228.

12. Півавар М.В. Развіццё грамадскага накірунку гістарычнага краязнаўства Беларусі ў 1960-90-я гады (гістарыяграфія праблемы) // Актуальные проблемы новой и новейшей истории Европы и США: материалы Республиканской научной конференции, Минск, 31 марта 2005 г. / Бел. гос. пед. ун-т. им. М. Танка; редкол.: Г.А. Космач (гл. ред. и др.). – Мн.: БГПУ, 2005. 408 с. С. 352-356.

13. Півавар М.В. Грамадскае і школьнае краязнаўства Беларусі ў 60 80-я гады XX ст. // Романовские чтения: Сб. трудов Международной науч. Конференции / Под ред. О.В. Дьяченко. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2005. – 420 с. – С. 175-78

14. Півавар М.В. Развіццё гістарычнага краязнаўства Беларусі ў 1960–1990-я гг.: здабыткі, праблемы, перспектывы // Подготовка педагогических кадров и научных кадров историков и развитие исторической науки в Беларуси. Материалы республиканской научно-практической конференции 30 сентября 2004 года., Гродно / Под ред. Е.А. Ровбы, А.Н. Нечухрина, И.Н. Креня. – Гродно: ГрГУ, 2005. – 404 с. – С. 238-241.

## Рэзюмэ

### Півавар Мікалай Васільевіч
### "Развіццё гістарычнага краязнаўства ў Беларусі ў 1961–1991 гг. (па прыкладзе грамадскага і школьнага накірунку)"

**Ключавыя тэрміны**. краязнаўства, школа, пошукавы рух, музеі, ахова помнікаў, турызм, грамадскія арганізацыі, Беларускі фонд культуры, краязнаўчая камісія, краязнаўцы-аматары, ідэалогія, выхаванне, самасвядомасць, «Узгор'е», Беларускае краязнаўчае таварыства.

**Мэта даследавання:** прааналізаваць развіццё грамадскага і школьнага накірункаў гістарычнага краязнаўства Беларусі ў перыяд з 1961 г. па 1991 г.

**Аб'ект даследавання:** працэс развіцця гістарычнага краязнаўства ў Беларусі ў 60–80-я гады XX ст. **Прадмет даследавання:** грамадскае і школьнае гістарычнае краязнаўства Беларусі.

**Навуковая навізна атрыманых вынікаў** заключаецца ў тым, што ўпершыню прааналізаваны і ўведзены ў навуковы зварот раней не вывучаныя архіўныя матэрыялы, якія закранаюць шырокі спектр праблем, звязаных з развіццём грамадскага і школьнага напрамкаў у гістарычным краязнаўстве Беларусі ў 1961–1991 гг. Асобна адзначым увядзенне ў навуковы зварот вялікай колькасці неапрацаваных дакументаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, якія тычацца дзейнасці Беларускага фонду культуры, яго краязнаўчай камісіі. Прааналізаваны і ўводзяцца ў навуковы зварот даследаванні гістарычнага краязнаўства Расіі, Украіны, Польшчы, якія маюць важнае значэнне для далейшай распрацоўкі металалогіі вывучэння беларускага краязнаўства.

На аснове архіўных матэрыялаў і апублікаваных крыніц створана комплексная работа, у якой вызначаны вытокі сучаснага краязнаўства, прааналізаваны працэс стварэння і арганізацыйнага-метадычнага ўмацавання грамадскага і школьнага накірункаў краязнаўства, яго асноўныя формы і вынікі працы.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Выкладзены ў дысертацыі матэрыял можа быць выкарыстаны для падрыхтоўкі вучэбнай літаратуры і абагульняючых прац, стварэння лекцыйных курсаў па гісторыі Беларусі і славянскіх народаў, спецыяльных курсаў па гісторыі краязнаўства.

Пераасэнсаванне назапашанага вопыту можа служыць не толькі навуковаму даследаванню гісторыі краязнаўства і грамадскіх адносін, але і выкарыстоўвацца пры фарміраванні дзяржаўнай ідэалогіі ў нашай краіне на сучасным этапе.

## Резюме

**Пивовар Николай Васильевич**
**Развитие исторического краеведения в Беларуси в 1961–1991 гг.**
**(на примере общественного и школьного направлений)**

**Ключевые понятия:** краеведение, школа, поисковое движение, музеи, охрана памятников, туризм, общественное организации, Беларуский фонд культуры, краеведческая комиссия, краеведы-любители, идеология, воспитание, самосознание, «Узгор'с», Беларуское краеведческое общество.

**Цель исследования:** проанализировать развитие общественного и школьного направлений исторического краеведения Беларуси в период с 1961 г. по 1991 г.

**Объект исследования:** процесс развития исторического краеведения в Беларуси в 60–80-я годы XX в. **Предмет исследования:** общественное и школьное историческое краеведение Беларуси.

**Научная новизна полученных результатов** заключается в том, что впервые проанализированы и введены в научный оборот ранее не исследованные архивные материалы, которые затрагивают широкий спектр проблем, связанных з развитием общественного и школьного направлений в историческом краеведении Беларуси в 1961–1991 гг. Особо отметим введение в научный оборот большого количества необработанных документов Национального архива Республики Беларусь, которые относятся к деятельности Беларуского фонда культуры, его краеведческой комиссии. Проанализированы и вводятся в оборот исследования исторического краеведения России, Украины, Польши, которые имеют важное значение для разработки методологии изучения беларуского краеведения.

На основе архивных материалов и опубликованных источников создана комплексная работа, в которой определены истоки современного краеведения, проанализированы процессы создания и организационно-методического укрепления общественного и школьного направлений краеведения, его основные формы и итоги деятельности.

**Практическая значимость полученных результатов**. Диссертационный материал может быть использован для подготовки учебной литературы и обобщающих исследований, создания лекционных курсов по истории Беларуси и славянских народов, специальных курсов по истории краеведения.

Полученные результаты могут быть использованы при формировании государственной идеологии на современном этапе.

## Resume

**Mikalai V. Pivavar**

**Development of historical local lore of Belarus in 1961–1991 years (on example of civic and school directions)**

**Key words:** study of local lore, school, prospecting work, museums, protection of monuments, tourism, funds, Belarus culture foundation, committee of study of local lore, amateurs of the local lore, ideology, upbringing, (self-)consciousness, "Uzhor'e", Belarus society of local lore studies.

**Purpose of research:** to analyze development of **civic and school directions** of **historical local lore of Belarus in period of 1961–1991 years**.

**Object of research:** process of development of historical local lore of Belarus in 60–80-th years of XX century. **Subject of research:** civic and school historical local lore of Belarus.

**The scientific novelty** judging by the results, is that first analyzed and put into circulation unexplored before archival materials, which connected with deep circle of problems of development civic and school directions in local lore studies of Belarus in 1961–1991years.

Separately note, that a lot of documents of National Archives of Republic of Belarus were putted into scientific using. It connected with activities of Belarus culture foundation, its committee of study of local lore. Analyzed and put into circulation investigations of Russian, Ukraine, Poland researchers of historical local lore studies. This ideal to our mind have great importance for development of methodology of investigations of Belarus local lore studies. In investigation analyzed processes of development of civic and school directions in local lore studies, the main form and results of activities in 1961–1991 years.

**Practical significance of the results.** Results of the research may be used in preparing of education literature and generalize works. Preparing of lecture courses on the history of Belarus, Slavonic people, special courses on the history of local lore studies.

Critical comprehension of results could be used in elaboration of state ideology of our country at present days.